*Аляксандр Смолік*

# МУЗЕЙ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ СОЦЫУМА

У XXI стагоддзі ў нашым грамадстве ўзрасла ўвага грамадскасці і ўладных структур Беларусі да праблем захавання, вывучэння і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нашага народа.Такі інтарэс да культурнай спадчыны выклікаў усплеск музейнай справы. На фоне сацыякультурнай дэструкцыі, калі інтэнсіўна скарачаліся установы культуры і мастацтваў, у галіне музейнага будаўніцтва адбываўся рост колькасці музеяў рознага тыпу. Так, за 20 апошніх гадоў у нашай краіне было зачынена больш 5 тысяч бібліятэк, клубаў і Дамоў культуры. Вывучэнне сітуацыі ў музеязнаўстве сведчыць: музеі не толькі не зачыняліся, а наадварот назіраўся працэс стварэння новых установ музейнага тыпу. У перыяд з 1990 па 2005 гады колькасць павялічылася са 111 да 133 устанноў, а колькасць супрацоўнікаў павялічылася на 1102 чалавекі [2, с. 58]. Такі сацыякультурны феномен можна патлумачыць тым, што сёння музеі са сваімі экспазіцыямі разглядаюцца як нейкі культурны тэкст (знакавы, вярбальны), які патрабуе прачытання. Рэпрэзентуючы наведвальніку тыя альбо іншыя матэрыялы, уводзячы яго ў сімвалічную рэальнасць, музей здзяйсняе ў сваей практычнай рабоце пераход ад слова да падзеі і пры гэтым нярэдка пераўтварае наведвальніка ў непасрэднага і зацікаўленага ўдзельніка гэтай падзеі. У сучасных беларускіх музеях разгортваецца адукацыйны працэс, адбываецца збліжэнне раней разрозненых кампанентаў культуры, паколькі музей адначасова нярэдка становіцца і тэатрам, і бібліятэкай, і школай. Традыцыйнае музейнае асяроддзе бытавання матэрыяльных прадметаў і твораў мастацтва пераўтвараецца ў змястоўна напоўненную прастору соцыума, у якой наведвальніку прадстаўляецца магчымасць адчуць разнастайныя ўражанні. Сёння кожны беларускі музей асэнсоўвае сябе ў якасці носьбіта канкрэтных старонак айчыннай культуры і прапаноўвае наведвальніку розныя спосабы арыентацыі ў культурнай прасторы.

Музейны свет Беларусі ўяўляе сабой культурную прастору грамадства, у якой адбываецца захаванне каштоўных для краіны аб'ектаў гісторыі, культуры і прыроды. У Беларусі маецца шэраг рэгіёнаў, якія насычаны помнікамі архітэктуры і музеямі, захаваўшы гістарычную забудову XI — пачатка XX стст. Да іх адносяцца соцыумы Полацка, Гомеля, Гродна, Віцебска і інш. [3]. Так, прастора Полацкага соцыума прадстаўлена ўнікальнай гісторыка-культурнай спадчынай, шэраг артэфактаў якой мае сусветнае значэнне (Сафійскі сабор, Вялікі пасад, комплекс фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст., Полацкае Евангелле XII ст., стыхіра Св. Еўфрасінні Полацкай, кніжны збор Сімяона Полацкага і інш.). Асаблівасцямі полацкай культурнай прасторы з'яўляюцца: яе аўтэнтычнасць, разнастайнасць і адносна добрая захаванасць. У сувязі з гэтым музеі Полацка здольны выканаць асноўную сацыяльную функцыю — дакументаваць культурна-гістарычнае асяроддзе — і стаць горадам-музеем. Даследаванне месца і ролі музеяў у культурным соцыуме Полацка, першага беларускага горада, сталіцы першай паўпавартаснай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі, дае падставы меркаваць, што музеі Полацка паступова пераўтвараюцца ў адзін з важнейшых рэгіёнаўтвараючых фактараў, і структура музейнай дзейнасці пачынае супадаць з рэгіянальнай прадметна-прасторавай структурай культурнай спадчыны. Тут функцыянуе Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, структура якога ўяўляе сабой музейнае аб'яднанне (11 філіялаў: Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Краязнаўчы музей, Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай–Марчанка, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, стацыянарная выстава «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай», Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Дзіцячы музей, Мастацкая галерэя, Прыродна-экалагічны музей) з некалькімі агульнымі для ўсяго запаведніка аддзеламі (аддзел фондаў, навукова-рэстаўрацыйны, навукова-асветніцкі, навукова-інфармацыйны) [4]. У 1980–1990-х гадах, калі ў музейным праектаванні вядучым стаў эксперыментальны напрамак, ідэя музейнага аб'яднання на прынцыпах фарміравання цэнтралізаванай сістэмы музеяў розных профіляў атрымала тэарэтычнае і фактычнае абгрунтаванне. Запаведнік увасобіў адукацыйна-выхаваўчыя і дыдактычныя набыткі музеяў навучальных установ гарадскога соцыума, феномен Полацкага краязнаўчага музея, вынікі працы грамадскіх установ па вывучэнню і ахове нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Традыцыі, якія былі характэрнымі для кожнага з перыядаў музейнага будаўніцтва ў Полацку, атрымалі якаснае праламленне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў функцыянальнай мадэлі гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Аналіз асноўных напрамкаў работы Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка дае магчымасць прагназаваць будучае развіццё музеялогіі ў Беларусі і далучэнне яе да міжнароднай музейнай супольнасці.

Культурная прастора соцыума і музейная дзейнасць, якая арганізавана вакол яе, як адна з форм сацыяльнакультурнай практыкі, сталі ўмовамі адраджэння рэгіянальнай культуры. Культурны рэгіён, які фарміруецца пры ўзаемадзеянні прыроднага і культурна-гістарычнага асяроддзя з сучаснай сацыяльнакультурнай практыкай, з'яўляецца асноўным аб'ектам рэгіянальнай музейнай дзейнасці. У сучасных умовах музейная дзейнасць разумеецца як дзейнасць грамадства ў адносінах да прыроднай і культурнай спадчыны. Яна павінна стаць складаючай часткай мясцовых культурных працэсаў, а музейная сетка соцыума — сфарміравацца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс.

Трэба адзначыць, што музеялогія не звязана толькі з асэнсаваннем мінулага і сучаснасці, яна адначасова з выяўленнем заканамернасцей данай рэчаіснасці прадстаўляе нам сродкі для таго, каб праграміраваць будучыню музеяў, арыентаваць музейнае развіццё ў суадносінах з перадумовамі яго аптымальнага выкарыстання. Музеялогія, такім чынам, адыгрывае пазнавальную ролю не толькі з пункту гледжання гісторыі і сучаснага стану музейнай справы, але і яе будучыні.

На сучасным этапе ў дзейнасці беларускіх музеяў назіраюцца інверсійныя тэндэнцыі: з'яўляюцца новыя віды і профілі музеяў, методыкі вывучэння музейных збораў, нязвыклыя экспазіцыйныя формы, трансфармуюцца ўзаемаадносіны музея і наведвальніка. Сёння музеі звяртаюцца непасрэдна соцыума. Новыя экспазіцыйныя ідэі, зацвярджэнне музейнай педагогікі ў якасці самастойнага напрамку, выкарыстанне ў музейнай практыцы апошніх дасягненняў сацыялогіі, семантыкі, камп'ютэрнай тэхналогіі ператвараюць традыцыйны музей у інтэграваны сацыяльны інстытут. Значнасць жа такой установы залежыць ад яе інфармацыйнага і камунікатыўнага патэнцыялу, тэхнічных магчымасцей, наяўнасці кваліфікаваных спецыялістаў і дасканалай тэарэтычнай праграмы. Шматпрофільны ці інтэграваны музей уяўляе сабой адзін з этапаў у распрацоўцы сучаснай канцэпцыі дзейнасці музея. Соцыум і музей шукаюць мадэль, якая дазволіла б ім узаемакарысна існаваць.

Вынікам інверсіі ў музейнай справе сталі інтэрактыўныя музеі, дзіцячыя музеі з інтэрактыўнымі праграмамі, музеі-запаведнікі, скансэны, гісторыка-культурныя музеі, экамузеі. Аб'ектамі музейнага паказу з'яўляюцца не толькі артэфакты, але і археалагічныя, архітэктурныя помнікі, ансамблі гарадоў, прыродныя ландшафты. Музеефікацыя архітэктурных аб'ектаў дае магчымасць у шэрагу выпадкаў размясціць у будынках помнікаў культуры гістарычныя, архітэктурна-мастацкія, мемарыяльныя і этнаграфічныя экспазіцыі. У выніку інверсіі музеяў, асабліва пасля з'яўлення за мяжой, а потым і ў Рэспубліцы Беларусь, экамузеяў і музеяў-запаведнікаў, нарадзілася магчымасць значна пашырыць поле музеялогіі, уключыўшы ў яго ўсю культурна-гістарычную спадчыну.

У культурнай прасторы соцыума музеі імкнуцца весці актыўную работу па стварэнню функцыянальнай мадэлі ў сістэме «музей-культура-соцыум», якая, абапіраючыся на музейныя традыцыі, улічвае і новыя дасягненні сучаснай музеялогіі і культуралогіі. Сучасную функцыянальную мадэль перспектыўнага развіцця музея можна ахарактарызаваць так: захаванне культуры ў комплексе праз музеефікацыю унікальнай гістарычнай тэрыторыі соцыума з удзелам не толькі прафесійных музеёлагаў і патэнцыяльных наведвальнікаў музеяў, але і ўсіх сацыяльна-узроставых груп грамадства. Асноўнымі задачамі па рэалізацыі такой мадэлі з'яўляюцца: праца ў захавальніцкай, культурна-творчай, адукацыйна-выхаваўчай сферы, арганізацыя навуковых даследаванняў, развіццё турызму.

Трэба адзначыць, што музеі горада, як сацыякультурны інстытут, у іх стварэнні, функцыянаванні і развіцці прама звязаны з гісторыка-культурнай спадчынай, захаванасць якой залежыць ад ацэнкі і ўспрымання яе наступнымі пакаленнямі. Музей фарміруе адносіны да культурнай спадчыны і інтарэс да мінулага. Аналіз месца і ролі музеяў (у культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форме музея-запаведніка) у культурнай прасторы Полацка дазволіў выпрацаваць асноўныя прыярытэты, крытэрыі і напрамкі ў комплексным захаванні культурнай спадчыны горада, якія былі пакладзены ў аснову мадэлі стратэгіі яе захавання. Упершыню даследаванне музейнай дзейнасці ў рамках культурнай прасторы горада стала базай для фарміравання канцэпцыі і стратэгіі захавання гісторыка-культурнай спадчыны асобнага рэгіёна.

Музеі Беларусі ў пэўнай ступені выступаюць як сімвал стабільнасці развіцця музейнай справы краіны. Абапіраючыся на шматвекавую гісторыю і выконваючы свае сацыяльныя функцыі, яны далучаюцца да выхавання паўнацэнных грамадзян — будаўнікоў сваёй краіны, творцаў будучыні. Ва ўмовах музеефікацыі цэлых гістарычных тэрыторый, як гэта адбываецца ў шэрагу соцыумаў, працэс ідзе тым імклівей, як хутчэй ён спрыяе далучэнню чалавека сённяшняга да спрадвечных гістарычных вартасцяў свайгосоцыума, нарэшце, і краіны. Музей ужо сёння ёсць неад'емная частка культурнай прасторы, самаідэнтыфікацыі народа, фарміравання яго самасвядомасці на падмурку спрадвечных агульначалавечых маральных каштоўнасцей і прынцыпаў.

**Спіс літаратуры**

1. Алексеев, В. П. Музееведение. Музеефикация. Культура. / В. П. Алексеев // Вестн. музейн. Комиссии. — М., 1990 — № 1. — С. 10—19.

2. Беларуская культура сёння. 2005. Гадавы агляд — Мн. : БелІПК — 2006. — 58 с.

3. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918—1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі. — Мн. : Веды, 2002. — 130 с.

4. Джумантаева, Т. А. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік / Т. А. Джумантаева // Памяць. Полацк: гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2002. — С. 864—865.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ